Жыве Беларусь!

ПРУЖАНСКАЕ ВЕЧА

№ 3 Незалежная грамадска-палітычная газета Пружаншчыны красавік 1994 г.

„Царскае сяло"

Наша царскае сяло
Вельмі буйна расцвіло.
Будаўніцтва хутка йдзе —
Першым у дом хто ўвайдзе?

Чый найлепшы тут катэдж?
Гэты ўзводзіць прадавец,
А гэты — нам., той — старшыня,
За ім — партакратава радня...

Майго дома няма тут,
Хоць шукай яго ўвесь год.
Дзе ж мільёны тыя ўзяць,
Каб катэдж свой збудаваць?

На сваю, браток, зарплату
Збудуеш толькі Жучцы хату.
Дом-палац у тым «сяле»
Толькі сніцца нам у сне.

Грыша Чужасельскі.

Суд ёсць суд...

У другім нумары «Пружанскага веча» быў надрукаваны мой артыкул «Непадгадаў», у якім ішла гаворка аб паездцы сакратара Пружанскага саюза моладзі Аляксандра Блізнюка на гэтак званы камуністычны кангрэс народа Беларусі. А. Блізнюк абвінавачваўся ў тым, што ездзіў гандляваць незалежнасцю Беларусі, што ён быў там дэлегатам і ўдзельнікі гэтага кангрэса мелі ўскоснае дачыненне да маскоўскага мяцяжу ў кастрычніку.

Аляксандр Блізнюк падаў на мяне і газету ў Івацэвіцкі суд. Пасяджэнне суда пачалося з таго, што сакратар З. Місюля заявіла: «Я не знаю белорусского языка, так как приехала сюда из России.» За ёй пракурор Т. Стасевіч сказала: «Не ломайте комедию, говорите на понятном языке.» Мы зазначылі, што суд абавязан ведаць дзяржаўную мову рэспублікі і што мы будзем гаварыць па-беларуску. Тады пракурор запатрабавала перакладчыка. Кампраміс знайшоў суддзя. Ён сказаў, што хоць украінец, але беларускую мову разумее.

Ніякія довады адказчыкаў у сваю абарону судом не былі прыняты. Суд абавязаў газету надрукаваць абвяржэнне, прынесці А. Блізнюку прабачэнне і кампенсаваць судовыя расходы.

Суд ёсць суд, яго рашенне трэба выконваць. На здзіўленне ўсяму, раблю я гэта з задавальненнем, бо Аляксандр Блізнюк, як высветлілася на судзе, аказаўся іншым, чым я думаў аб ім раней. Ён суду ўручыў пісьмовую даведку, што не з'яўляецца камуністам, даказаў, што не меў дачынення да маскоўскага мяцяжу, бо якраз тады здаваў у Менску экзамены — і копію заліковай кніжкі суддзі ўручыў. Даводзіў суду, што на кангрэсе быў не дэлегатам, а запрошаным, а Беларуссю гандляваць і не думаў.

Праўда, сведка А. Блізнюка першы сакратар пружанскіх камуністаў Анатоль Зубко растлумачыў суду, што Аляксандр Блізнюк усё ж быў дэлегатам. Суд чамусьці не палічыў патрэбным узяць гэта пад увагу.

Зыходзячы з вышэй сказанага, я здымаю свае абвінавачванні і прыношу Аляксандру Блізнюку сваё прабачэнне.

Віктар РАЧКО.

Ад рэдкалегіі: Так як аўтар артыкула «Непадгадаў» прынёс А. Блізнюку сваё прабачэнне, то нам застаецца толькі далучыцца да гэтага.

Коратка аб усім

У лютым прайшла ІІІ-я Пружанская раённая канферэнцыя БНФ. Прааналізавана палітычная абстаноўка ў рэспубліцы і раёне, распрацаван план дзеянняў раённай арганізацыі БНФ на бліжэйшы час. Прысутнічала на канферэнцыі каля ста чалавек. Утворана раённая арганізацыя партыі БНФ.

✦ ✦ ✦

У гарадскім савеце на чарговай сесіі старшыня савета так і не выбраны. Спроба сабраць сесію ў сярэдзіне сакавіка не ўдалася з-за няяўкі многіх дэпутатаў.

Крызіс гарадской улады працягваецца.

✦ ✦ ✦

На вечары сустрэчы выпускнікоў Мураўскай школы прысутнічаў міністр абароны РБ Павел Казлоўскі — выпускнік гэтай школы. Гэта не першы візіт міністра ў родныя мясціны. Пахвальна, што спадар Казлоўскі не забывае і не цураецца сваіх каранёў. Шкада толькі, што ўсё гэта слаба ўплывае на рост яго нацыянальнай свядомасці.

✦ ✦ ✦

Як ужо паведамлялася, у першым нумары нашай газеты, пры размеркаванні кватэр у «чарнобыльскім» доме (вул. Інтэрнацыянальная, 8) гарвыканкамам былі дапушчаны парушэнні закона. Камісія, што выявіла гэтыя факты, звярнулася з заявай у Пружанскую пракуратуру. Было праведзена расследаванне. З сямі кватэр, якія камісія палічыла размеркаванымі незаконна, пракуратура ўстанавіла парушэнні толькі ў чатырох выпадках — гэта пры выдзяленні кватэр Шопіку А. Ф., Цясноўскай Г. В., Замковічу М. М. і Тарасюку Я. М.

Не верыць пракуратуры няма падстаў. Вось толькі вывад, які робіць пракуратура, вельмі ж ужо туманна-мяккі. «Основной причиной допущенных нарушений при распределении жилья в 64-квартирном доме по улице Интернациональной, 8 является недостаточный контроль со стороны исполкома городского Совета за правильностью предоставляемых документов при предоставлении гражданам жилых помещений и утверждении совместных решений администрации и профсоюзного комитета предприятий и организаций о предоставлении жилья.»

Атрымліваецца, што ва ўсім вінаваты не гарвыканкам, а яго «недостаточный контроль». А што ж недастаткова кантралявалася выканкамам, выкладзена такой канцыляршчынай, што з цяжкасцю паддаецца разуменню.

✦ ✦ ✦

Наша ўлада, у тым ліку раённая і абласная, усё часцей і усё больш бессаромна залазіць у кішэні сваіх грамадзян. І не толькі шляхам павышэння цэн на прадукты харчавання, адзення, абутак . . . Вось апошні прыклад. Рашэннем Пружанскага райвыканкама ад 10. 03. 94 г. толькі два-тры дні на тыдзень мы зможам ездзіць на прыгарадных аўтобусах, купляючы білеты па дзяржаўнай цане і карыстаючыся льготамі. Астатнія 4—5 дзён плаціць за праезд будзем па гэтак званых свабодных тарыфах. Прычым гэта ў дні найбольшага прытоку пасажыраў—у пятніцу, суботу, нядзелю і панядзелак. Акрамя таго, што цэны «кусаюцца», на гэтыя рэйсы фактычна адмяняюцца ўсе льготы, за выключэннем льгот для інвалідаў і школьнікаў.

✦ ✦ ✦

Па прапанове Прэзідыума абласнога Савета вызвалены ад работы загадчык аддзела па прыватызацыі райвыканкама (былы старшыня гарвыканкама) Рыгор Трэбнікаў. Праўда, з дазволу райвыканкама ён звольніўся ганарова — сам напісаў заяву.

✦ ✦ ✦

У Вярхоўным Савеце РБ — «парад генералаў». Новы старшыня ВС — генерал, два новыя генералы ўзначалілі КДБ і МУС, старшынёй камісіі ВС па абароне, нацыянальнай бяспецы і барацьбе са злачыннасцю выбраны таксама генерал. Прапанова Ніла Гілевіча і апазіцыі БНФ аб тым,каб гэту камісію ўзначаліў беларус, не была падтрымана наменклатурнай большасцю ВС.

✦ ✦ ✦

Саўмін усё больш рашуча прыбірае да сваіх рук прэсу. Выступаючы на семінары перад старшынямі мясцовых саветаў, Вячаслаў Кебіч заявіў: «Мы будем командовать средствами массовой информации». Бальшыня слухачоў аж у далоні запляскала. Што-што, а камандаваць яны вялікія аматары.

Вось табе і незалежная прэса, вось табе і чацвёртая ўлада!

✦ ✦ ✦

Нарэшце Вярхоўны Савет прыняў новую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Дзень 15 сакавіка абвешчаны святочным.

Гэта не першая наша Канстытуцыя. У нас ёсць славуты Статут Вялікага Літоўскага княства, Устаўныя граматы Беларускай Народнай Рэспублікі. Новая Канстытуцыя працягвае і дапаўняе гэты спіс.

✦ ✦ ✦

Наколькі вядома, кіраўніцтва гарадской і раённай улады (старшыні, іх намеснікі, загадчыкі аддзелаў...) прыпыніла сваё членства ў партыі. Гэта зроблена, відаць, для таго, каб улада была нейтральнай, аб'ектыўнай у адносінах да іншых партый і рухаў, да грамадзян, а значыць, і больш справядлівай.

А што на самай справе атрымліваецца?

Да прыкладу, сабіраецца бюро партыі камуністаў, савет ветэранаў і група афіцэраў запасу, каб стварыць гэтак званы раённы народны камуністычны рух. І дзе б вы думалі яны сабіраюцца? Ды ў малой зале Дома саветаў, так бы мовіць, пад крылом раённай улады.

А на гарадскім сходзе ветэранаў у прэзідыуме чынна засядае далёка не ветэранскага ўзросту першы сакратар раённых камуністаў, кіраўнік справамі райвыканкама і намеснік старшыні гарсавета. Усё, як тады, калі рулявала «честь и совесть нашей эпохи».

Або вось яшчэ. Стараннямі ваенкамата ўтвараецца 12 лютага раённая арганізацыя саюза афіцэраў. Благаслаўляюць новую арганізацыю зноў жа першы сакратар камуністаў і кіраўнік справамі райвыканкама. Але самае пікантнае ў тым, што гэты саюз, не паспеўшы стаць на ногі, адразу ж цягнецца ў камуністычны рух, дэлегата на з'езд гэтага руху выбірае. Дарэчы, тут узнікае адно пытанне: як гэты саюз афіцэраў мог быць прыняты ў раённы народны камуністычны рух 4 лютага, калі ён утвораны толькі 12 лютага?

Адносна ж нейтральнасці і аб'ектыўнасці нашай мясцовай улады пасля ўсяго вышэй сказанага сумненне ўзнікае.

✦ ✦ ✦

У самы блізкі час нашы «зайчыкі», відаць, набудуць статус нацыянальнай валюты. А што з рублёвай зонай? Гульня вакол яе ўсё яшчэ працягваецца, а зоны няма. Ну і дзякаваць Богу. Нам трэба спадзявацца найперш на сябе, а не на добрага дзядзьку.

Краіны, што ўваходзяць у Еўрапейскі эканамічны саюз (ЕЭС), 30 год ідуць да адзінай валюты, а нашы кіраўнікі гэта зрабіць хочуць за 30 дзён. У народзе кажуць: паспяшыш — людзей насмяшыш.

На ўсё свой час, спадары!

✦ ✦ ✦

Незалежны інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў прыводзіць за сакавік такія лічбы:

68, 8 % апытаных выказаліся за датэрміновыя выбары ў Вярхоўны Савет, супраць — 7,7 %;

43, 3 % лічаць неабходнымі выбары прэзідэнта, не згодны 26,4 %;

17,7 % аддалі б свае галасы на выбарах за Беларускі Народны Фронт;

10 % — за Беларускую сялянскую партыю;

15,9 % падтрымалі б Рух за дэмакратыю і сацыяльны прагрэс (так называюцца аб'яднаныя пракамуністычныя сілы);

10, 5 — за партыю камуністаў Беларусі;

69, 5 % апытаных ацанілі на «дрэнна» і «нездавальняюча» дзейнасць урада Вячаслава Кебіча.

✦ ✦ ✦

У канцы сакавіка намеснік В. Кебіча спадар Мясніковіч правёў нараду ў Брэсце з кіраўнікамі прадпрыемстваў і банкаў. На гэтай нарадзе ён заявіў, што кандыдатура Вячаслава Кебіча будзе вылучана на пасаду прэзідэнта і выказаў надзею, што прысутныя яе падтрымаюць.

Ці ўсіх задаволіў адказ?

Калі вы думаеце, што справаздачна - выбарныя сходы ў калгасах праходзяць па-новаму, інакш, то памыляецеся.

Мы, сакратар Пружанскай арганізацыі сялянскай партыі Іван Хадзяеў, дэпутат раённага савета Галіна Чаркасава і дэпутат гарадскога савета Аляксандр Жаркоў, нядаўна пабывалі на такім сходзе ў калгасе «Дружба» і можам гэта засведчыць.

Дэмакратызму тут было столькі, як і некалі. Калгаснікі, як і даўней, адмоўчваліся. З паказной увагай яны слухалі сваё начальства, паслухмяна са ўсім пагаджаліся.

Нам жа калгаснае кіраўніцтва дазволіла прысутнічаць з вялікай неахвотай.

Мы задалі на сходзе калгаснікам вось такое пытанне: хто будзе жыць у г. Пружаны па вул. Новай у 15-кватэрным доме, будаўніцтва якога завяршаецца з долевым удзелам к-са «Дружба»?

Трэба растлумачыць, што долевы ўзнос на гэты дом унеслі:
к-с «Дружба» — 1 кватэра,
к-с Чапаева — 1 кватэра,
Аранчыцкі хлебапрыёмны пункт — 2 кв., Інспекцыя дзяржстраха — 1 кв., Санэпідстанцыя — 1 кв.,
чарнобыльцам — 1 кв. і яшчэ 8 далевікоў — грамадзян г. Пружаны.

Выслухаўшы пытанне, калгаснікі маўчалі. Тады старшыня даў вось такі адказ: калі будаўніцтва дома завершыцца, то гэту кватэру нехта выкупіць.

На жаль, ніхто з калгаснікаў не пацікавіўся, хто гэты нехта, якому калгас за калгасныя грошы зрабіў такую паслугу.

Галіна ЧАРКАСАВА.

Іван ХАДЗЯЕЎ.

Чым займаецца гэта ведамства?

(Інтэрв'ю з начальнікам Пружанскага аддзела КДБ)

Есць у нашым раёне ўстанова з такой вось назвай: Пружанскі раённы аддзел кіраўніцтва камітэта дзяржаўнай бяспекі (КДБ) Рэспублікі Беларусь па Брэсцкай вобласці.

Прадстаўнік нашай газеты Сарока Генадзь, перш чым задаць пытанні, звярнуўся з такімі вось словамі да кіраўніка гэтай установы: «Уладзімір Васільевіч Навахацька, Вы кіруеце ведамствам раёна, якое раней верай і праўдай ахоўвала таталітарны рэжым, яго стрыжань — КПБ - КПСС, займалася палітычным вышукам. Пасля вядомых падзей у жніўні 1991 года гэтая злачынная структура развалілася. Чытачам «Пружанска-веча» (яны ж падаткаплацельшчыкі, за грошы якіх фінансуюцца гэтыя структуры) цікава было б пазнаёміцца з вамі і кіруемай вамі службай».

Пытанне: У межах магчымага і дазволенага скажыце, калі ласка, чым займаецца ваша служба, колькі чалавек у штаце, які рэгіён Вы абслугоўваеце?

Адказ: Найперш хачу заўважыць, пасля жніўня 1991 года КДБ Рэспублікі Беларусь не развалілася, як Вы сказалі. Болей таго, ён у адрозненне ад падобных ведамстваў у рэспубліках былога СССР захаваў сваю назву. Пракуратурай рэспублікі, як Вам вядома, праводзілася расследаванне па выяўленню фактаў магчымага ўдзелу КДБ Рэспублікі Беларусь у дзейнасці ГКЧП. Аднак такіх фактаў не атрымана, так як у сапраўднасці КДБ РБ ніякіх практычных мераў па падтрымцы ГКЧП не прадпрымаў . . .

Галоўнымі задачамі, якія вырашаюцца асабовым саставам, з'яўляюцца: дабыванне звестак аб планах і намерах разведдальна-падрыўной дзейнасці спецслужбаў замежных дзяржаў, а таксама аб канкрэтных разведвальных акцыях, накіраваных на падрыў суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці рэспублікі, . . . забеспячэння абароны эканамічных інтарэсаў рэспублікі, аператыўнае прыкрыццё граніцы, ажыццяўленне барацьбы з кантрабандай і наркабізнесам, . . . барацьба з тэрарызмам, карупцыяй і інш.

Акрамя таго, . . . праводзіцца вялікая работа па рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 1920-1980 гадоў. . .

Штат райаддзела невялікі — 3 чалавекі . . .

Пытанне: Раскажыце, калі ласка, коратка аб сабе, жыццёвым і працоўным шляху, грамадскай дзейнасці, сям'і.

Адказ: Нарадзіўся я ў 1948 годзе у Расіі. Скончыў тэхнікум. Служыў на флоце. З 1972 года у органах дзяржаўнай бяспекі. Скончыў Маскоўскі юрыдычны інстытут. Чатыры гады працаваў у КДБ Грузіі. У Беларусі з 1984 года. Начальнікам Пружанскага райаддзела з 1987 г. Жонка працуе служачай у адной з устаноў, дачка вучыцца ў тэхнікуме. Дачы не маю, асабістай аўтамашыны — таксама.

Чытачам вашай газеты жадаю моцнага здароўя, душэўнай раўнавагі і дабраты, міласэрнасці да людзей.

Уражанні аб сустрэчы

13 сакавіка ў гарадскім Доме культуры у Пружанах адбылася сустрэча выбаршчыкаў з народным дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Іванам Сямашкам. У сустрэчы прыняў удзел народны дэпутат ВС РБ Станіслаў Шушкевіч і старшыня Аб'яднанай дэмакратычнай партыі Аляксандр Дабравольскі.

12 гадзін дня. Людзей прыйшло вельмі многа. Усе крэслы заняты. Многія стаяць ля сцен і ў праходзе. Група камуністаў прыйшла з плакацікамі-лозунгамі. Іх мэта — сарваць сустрэчу. Але не атрымалася.

Уступным словам сустрэчу адкрыў Іван Сямашка. Затым з прамовай выступіў Станіслаў Шушкевіч. Тых, хто трымаў плакацікі і выкрыкваў, ён запрасіў на сцэну, але ніхто не адважыўся. Спробы камуністаў выкрыкваць і свістаць прысутнымі рашуча спыняліся.

Пасля выбаршчыкі ўважліва слухалі адказы на свае пытанні , якіх было вельмі многа, агульны змест якіх зводзіўся да наступнага: што і як мы павінны рабіць, каб выйсці з палітычнага, сацыяльнага і эканамічнага крызісу, у які завялі нас наменклатурны Вярхоўны Савет і пракамуністычны ўрад.

У карэктнай форме, вытрымана, грунтоўна і цывілізавана на ўсе пытанні даў адказы Станіслаў Шушкевіч. Нават і на правакацыйныя, ды яшчэ з гумарам, за што выбаршчыкі «плацілі» яму апладысментамі.

На маю думку, сустрэча была змястоўнай і карыснай для ўсіх.

Мікола РАЧКО.

Не на двух, а на трох крэслах!

Рэдкалегія нашай газеты атрымала артыкул першага сакратара партыі камуністаў Анатоля Зубко, у якім ён аспрэчвае сцверджанне аўтара допісу М. Волкава «Слова звычайнага члена прафсаюза да свайго старшыні», што сядзіць на двух крэслах («Пружанскае веча» №2).

Першы сакратар удакладняе: «Вы не далічыліся маіх пасад. У мяне іх не дзве, а тры .... так што сяджу не на двух, як вы пішаце, а на трох крэслах».

Выдаўцы газеты просяць у Анатоля Зубко прабачэння за няправільна пададзеную інфармацыю і шкадуюць, што з-за фінансавых страт, панесеных па судоваму іску шаноўнага Блізнюка Аляксандра, не могуць надрукаваць яго нага артыкула поўнасцю.

Рэдкалегія.

Сустрэча дэпутатаў з выбаршчыкамі

У дзень усебеларускага страйку, 15 лютага, адбылася ў Пружанах, у скверы перад універсамам, сустрэча дэпутатаў — сяброў БНФ з выбаршчыкамі. На сустрэчу сабралася каля 300 чалавек. Дэпутаты гарадскога савета Генадзь Сарока і Жаркоў Аляксандр расказалі аб рабоце савета, аб злоўжываннях былога старшыні Трэбнікава, аб карупцыі ва ўладных органах. Тлумачылі, што без адстаўкі Кебіча і яго пракамуністычнага ўрада, без датэрміновых выбараў Вярхоўнага Савета выйсці з крызісу і палепшыць жыццё людзей немагчыма. Не выратуе і рублёвая зона, у якую нас сілком цягнуць Вячаслаў Кебіч і Мечыслаў Грыб. Наш паратунак — гэта свая ўласная валюта, свая незалежная палітыка, раўнапраўнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва з Расіяй, з іншымі нашымі суседзямі, з другімі краінамі.

На сустрэчы выступіла дэпутат раённага савета Галіна Чаркасава. Дэпутаты адказалі на пытанні выбаршчыкаў.

Быў прыняты наказ дэпутатам:

1. Звярнуцца ў праваахоўныя органы з заявай аб прыцягненні да адказнасці за злоўжыванні былога старшыню Р. Трэбнікава.
2. Выслаць у Вярхоўны Савет пісьмо з наступнымі патрабаваннямі:

а) адправіць у адстаўку Кебіча і яго ўрад, стварыць часовы кааліцыйны ўрад;

б) назначыць канкрэтную дату датэрміновых выбараў Вярхоўнага Савета вясной бягучага года.

Іван ЗДАНОВІЧ.

Што зробіць для народа Беларуская сялянская партыя (БСП) ?

Гэта партыя дзейнічае ўжо тры гады і налічвае ў сваіх радах больш 10 тыс. сяброў. Есць і ў Пружанскім раёне яе невялікая пакуль арганізацыя. Распрацаваная і зацверджаная трэцім з'ездам БСП прадвыбарчая праграма адказвае на пытанне: «Што рабіць далей?»

Дзеля міру і дабрабыту беларускага народа БСП будзе цесна супрацоўнічаць з усімі дэмакратычнымі партыямі і грамадска-палітычнымі рухамі. Ужо створана аб'яднанне дэмакратычных партый і рухаў — «Вясна-94».

Калі народ даверыць уладу блоку дэмакратычных сіл, то БСП у саставе гэтага блока будзе актыўна працаваць на карысць народа, кіруючыся духам супрацоўніцтва і ўзаемаразумення.

Вось некаторыя найбольш важныя палажэнні прадвыбарчай праграмы

У сферы дзяржаўнага будаўніцтва:

— стварыць пастаянна дзеючы прафесійны парламент (не больш 120 народных дэпутатаў);

— правесці рэформу мясцовай улады: яе кіраўнік — мер будзе выбірацца народам і несці адказнасць за сваю дзейнасць перад выбаршчыкамі і судом;

— увесці адзіны падатак на зямлю і аддаць яго органам мясцовага самакіравання;

— рэфармаваць шляхам скарачэння на 50 % органы дзяржаўнага кіраўніцтва, у тым ліку і Саўмін.

У сферы эканомікі і аграрнай рэформы:

— увесці нацыянальную валюту і забяспечыць незалежнасць нацыянальнага банка ад урада:

— уключыць зямлю ў аб'екты прыватызацыі і гарантаваць кожнаму грамадзяніну Беларусі права атрымаць бясплатна долю зямлі;

— перадаць большую частку сродкаў вытворчасці ва ўласнасць грамадзян і працоўных калектываў рэспублікі;

— увесці такую падатковую сістэму, якая забяспечыць рост вытворчасці.

У сферы сацыяльнай абароны:

— ажыццявіць дзяржаўную праграму адраджэння вёскі;

— гарантаваць сацыяльную абарону інвалідам, пенсіянерам, беспрацоўным і шматдзетным сем'ям;

— накіраваць не менш 10 % бюджэту на фінансаванне аховы здароўя, адукацыі, навукі і культуры;

— павесці рашучую барацьбу з карупцыяй і злачыннасцю;

— ажыццявіць дзяржаўную праграму занятасці насельніцтва, арганізаваць бясплатную перакваліфікацыю грамадзян.

Трэба дабіцца, каб дзяржава служыла чалавеку, каб стабільнай стала эканоміка, каб павялічыўся нацыянальны доход і спыніўся рост цэн.

БСП будзе агітаваць наш народ за тое, каб ён прагаласаваў за выбранне Шушкевіча С. С. прэзідэнтам рэспублікі Беларусь.

Слова за вамі, шаноўныя выбаршчыкі!

Члены БСП: І. Хадзяеў, У. Шароў, М. Дземяшчей

Дадзена нам Богам...

Чатыры гады, як прыняты Закон аб мовах, у якім ёсць вось такія словы:

«Мова не толькі сродак зносін, а і душа народа, аснова і важнейшая частка яго культуры . . . Гонар і абавязак усіх — шанаваць родную мову, садзейнічаць яе развіццю і росквіту».

Суверэнная Рэспубліка Беларусь, на вялікі жаль, не забяспечвае паспяховай і своечасовай рэалізацыі Закона аб мовах. Замест гэтага пачасціліся бяссэнсоўныя спрэчкі аб двухмоўі, аб уціску рускамоўнага насельніцтва на Беларусі.

Беларуская мова дадзена нам, беларусам, Богам. Гэта наша самая дарагая спадчына.

Гаворачы пра выжыванне беларусаў, наш славуты пісьменнік Васіль Быкаў казаў, што ў нас, «як заўсёды, найбольшыя спадзяванні на мову, гэты галоўны нацыянальны набытак, нашае гістарычнае апірышча. Нездарма яе так вынішчалі стагоддзямі, забаранялі; аплёўвалі, адвучвалі ад яе цэлыя пакаленні. У імперыі патрэбна была адна імперская мова. Але калі мы, нацыянальна паніжаныя, класава раз'яднаныя спаскуджаныя шматгадовай маной, нешта ўсё ж значым у сусветнай суполцы народаў, дык найперш праз гэтую нашую мову».

Варта прыгадаць тут былога старшыню ВС Станіслава Шушкевіча, які аднойчы сказаў, што многія прапагандысты двухмоўя з'яўляюцца «прадстаўнікамі іншай нацыянальнасці, іншай краіны. Яны не маюць маральнага права змагацца з мовай той краіны, якая іх абагрэла і ўтрымлівае». Да гонару Вярхоўнага Савета, ён адхіліў прапанову аб двухмоўі і ў новай Канстытуцыі, прынятай 15 сакавіка, захаваў за беларускай мовай статус мовы дзяржаўнай.

Паважаныя беларусы, дык зробім ўсё, каб наша цудоўная родная мова жыла вечна!

Генадзь САРОКА

У нас будзе прэзідэнт.

Новая Канстытуцыя РБ, прынятая 15 сакавіка, устанаўлівае прэзідэнцкае праўленне ў нашай рэспубліцы. Падрыхтаваны Закон аб выбарах прэзідэнта. Прычым наменклатурна-камуністычная большасць ВС падагнала гэты Закон пад свае інтарэсы. Упрыватнасці прапануецца, каб права вылучаць кандыдатаў мелі дэпутаты ВС - не менш як 70 чалавек. А гэта значыць, што большасць зможа вылучыць нават дзве кандыдатуры, тады як апазіцыя, відаць, не набярэ 70 прыхільнікаў.

А каб вылучыць кандыдата ад насельніцтва, у Законе прапануецца сабраць 100 тысяч подпісаў, у дадатак па мудрона-складаных спісах, з пячаткай на кожным лісце мясцовай улады ды яшчэ за 20 дзён.

Было б лагічна і справядліва, каб кандыдаты вылучаліся толькі насельніцтвам, а Вярхоўны Савет быў пазбаўлен гэтага права.

Хоць Закон аб выбарах прэзідэнта толькі што прыняты, аднак прэса поўніцца рознымі меркаваннямі аб магчымых кандыдатах на гэту пасаду.

Кандыдатамі ад дэмакратычных партый і рухаў называюць Занона Пазняка, Станіслава Шушкевіча, Генадзя Карпенку.

Ад пракамуністычнай большасці ВС называюцца прозвішчы найперш Вячаслава Кебіча, потым Мечыслава Грыба, Васіля Новікава, Аляксандра Лукашэнкі.

Саюз прадпрымальнікаў, са свайго боку, прапануе ў кандыдаты свайго прэзідэнта Кулагіна.

Выбары прызначаць на 23 чэрвеня.

Іван ЗДАНОВІЧ.

БДЗВ

Створана новая грамадска-палітычная арганізацыя «Беларускае дэмакратычнае згуртаванне ветэранаў». Старшынёй яго стаў пісьменнік Артур Вольскі. Згуртаванне аб'ядноўвае ветэранаў працы, вайны і узброеных сіл незалежна ад нацыянальнасці. БДЗВ выступае за незалежнасць Беларусі, за дэмакратыю, за павышэнне жыццёвага ўзроўню людзей, за беларускае нацыянальнае адраджэнне.

\+ \+ \+

Але ці захоча народ?

Вячаслаў Кебіч распачаў актыўную падрыхтоўку да прэзідэнцкіх выбараў. Як стала вядома карэспандэнту «Свабоды,» у структурах ураду прызначаны камісары, адказныя за кожны раён . . .

Афіцыйным кіраўніком перадвыбарчага штабу Кебіча прызначаны віцэ-прэм'ер Мясніковіч. Фактычна ж усю справу будзе весці Г. Данілаў . .

Задача нумар адзін: апрача 70-ці дэпутацкіх подпісаў, сабраць за вылучэнне Кебіча кандыдатам у прэзідэнты яшчэ 150-200 тысячаў подпісаў выбаршчыкаў . . .

У райвыканкамы перададзены загад тэрмінова даць спісы людзей, гатовых увайсці ў ініцыятыўную групу збору подпісаў.

Кебіч пайшоў у народ. Але ці захоча народ Кебіча?

Перадрук з газеты «Свабода»

Заснавальнікі: Пружанская рада Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне».
Раённая рада Таварыства Беларускай Мовы.
Сябры Сялянскай партыі.
Сябры Фонду «Льва Сапегі.»

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў.

Рэдкалегія: Здановіч І. тэл. 2-23-23
Жытко К. — 2-31-38
Рачко В. — 2-13-15
Хадзяеў І. — 2-23-97
Чаркасава Г. — 2-33-51

Пружанская гарадская друкарня 385—999/8.04 94